# МАСТАЦТВА

• ТЭМА НУМАРА: ДУХОЎНАЯ ЦВЯРДЫНЯ БЕЛАРУСІ
900-годдзе Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра ў Полацку

• МАСТАЦКІ ЛЕТАПІС ПЕРАМОГІ:
МУЗЕЙ СЛАВЫ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ

• ВІЦЕБСК МАСТАЦКІ: КЛАСІКА АВАНГАРДУ

8 /2025
ЖНІВЕНЬ



16+




Галерэя «АртХаос», якая размясцілася ў сталічным гандлёвым цэнтры «Дана Мол», распачала сваю дзейнасць у 2017 годзе. Цяпер гэта добра вядомы арт-цэнтр, які карыстаецца папулярнасцю сярод аматараў мастацтва. Разам са станоўчымі водгукамі наведвальнікаў часам гучаць і пытанні: як адчувае сябе мастацкая галерэя ў атачэнні модных буцікаў, чаму ў назве «арт» спалучаецца з «хаосам» і ўвогуле — як з'явілася гэтая задума? Раскрываем не зусім патаемныя сакрэты і спрабуем адказаць на ўсе пытанні, якія часта дзе-нідзе ды ўзнікаюць.

# «АртХаос» — месца, дзе жыве мастацтва розных стыляў і напрамкаў

**Ксенія Ціханава**

*Фота з архіва аўтара*




За кожным сур'ёзным праектам стаяць сапраўдная мара, сумленная праца, настойлівасць і гатоўнасць рызыкаваць. Ідэя стварэння мастацкай галерэі «АртХаос» узнікла акурат дзякуючы гэтаму, і даволі спантанна. Развеяўшы ўсялякія чуткі, можна смела сцвярджаць, што рэалізацыі праекта паспрыялі добрыя адносіны паміж рознымі людзьмі і, безумоўна, узаемны інтарэс, любоў да мастацтва. Яшчэ падчас праектавання і будаўніцтва ўсяго комплексу «Дана Мол» ідэя пляцоўкі культурнага кшталту зацікавіла заснавальніка холдынга. Амаль адразу было вырашана стварыць галерэю жывапісу, і даволі хутка быў распрацаваны канкрэтны план.

Паступова вырашаліся і пытанні вонкавага і ўнутранага дызайну памяшкання, канцэпцыя і напрамкі дзейнасці галерэі. У сугуччы з агульным дызайнам усяго холдынга быў падрыхтаваны стыль выставачнай прасторы, які вызначыў колер сцен, наяўнасць светлавых, падвесных канструкцый і патрэбнай мэблі. Адначасова вялося стварэнне лагатыпа, фірмовага стылю, рэкламных матэрыялаў, распрацоўка анлайн-платформы, якая ўключае афіцыйны сайт, сацыяльныя сеткі і г.д.

Асобная ўвага надавалася графічнаму сімвалу, які б спрыяў росту пазнавальнасці і быў якасная часткай айдэнтыкі галерэі. Гэта своеасаблівая наглядная візітоўка, дубляваная ў друкаваных матэрыялах, на сайце і ў розных сучасных мэсэнджарах. Што датычыць назвы — яна мае дачыненне да абсалютна рознабаковых паняццяў. Гэта правакацыйная гульня слоў: мы чуем «арт хаус», тобок «дом мастацтва» ці «дом карцін», аднак афіцыйнае, задакументаванае найменне мае трошкі іншы выгляд — «АртХаос». Тут таксама маецца на ўвазе змешванне стыляў і напрамкаў у мастацтве, прадстаўле-



ным галерэяй. Таму ў лагатыпе дзве літары — «у» і «о» — аб'ядналіся.
За аснову колеравых спалучэнняў галерэйнай прасторы і друкаваных матэрыялаў былі ўзяты бірузовы і залацісты ды іх адценні (лагатып, буклеты, візіткі, упакоўка), белы (сцены, мэбля). Усе гэтыя колеры, на думку калектыву, спрыяюць добраму настрою, унутранаму супакаенню, а таксама належным чынам дэманструюць жывапіс ці графічныя работы так, што нічога не адцягвае ўвагу, а толькі дапамагае ўспрыманню твораў.
Лагатып галерэі размешчаны на ўпакоўцы і сувенірных пакетах, візітоўках і буклетах, блакнотах і фірмовых налепках. Дарэчы, над тым, якая павінна быць упакоўка, думалі найдаўжэй. Разважалі, ці то гэта будзе скрынка пад кожны фармат жывапісу, ці то нешта больш простае.
У выніку выбралі крафтавую паперу з лагатыпам. Аказалася гэта вельмі зручна і на самой справе вельмі бяспечна для твораў мастацтва, бо папера шчыльная і практычна не баіцца вільгаці.

**Калектыў уважліва ставіцца да кожнай дробязі, бо гэта неабходна для цэласнай стылістыкі і канцэпцыі галерэі. Усе кампаненты — і асноўныя, і дадатковыя — з'яўляюцца важнымі элементамі брэндынгу і маркетынгу.**

Дарэчы, вельмі цяжка заставацца ўвесь час цікавымі і захоўваць адрозненне ад канкурэнтаў. У Мінску было адкрыта нямала мастацкіх галерэй з добрымі водгукамі і неблагой паспяховасцю з камерцыйнага пункту гледжання. Не толькі якасны брэндынг спрыяе пазнавальнасці і ўвогуле рэпутацыі галерэі. І нават не сама канцэпцыя. Амаль паралельна з аздабленнем памяшкання ішоў актыўны пошук асноўных работнікаў — кампетэнтных мастацтвазнаўцаў, без якіх немагчыма стварыць імідж арт-інстытуцыі. Такім чынам, першапачатковым пытаннем у «АртХаосе» было не «каго дэманстраваць», а «хто будзе паказваць мастакоў наведвальнікам». Дарэчы, на вакансію мастацтвазнаўцы знайшлося шмат жадаючых: невялікае ўтульнае месца, зручнае месцазнаходжанне…
У супрацоўнікаў галерэі вельмі складаная і адказная роля. Вобразна кажучы, яны — аблічча галерэі. Як аказалася, не толькі дызайнерскія сцены, старанна прадуманая падсветка і ў цэлым арганізацыя прасторы прываблівають гледача. Важна, каб наведвальнікаў сустракаў дасведчаны ў мастацтве, камунікабельны чалавек з пачуццём гумару. Самымі каштоў-





ымі аспектамі тут з'яўляецца ўменне выклікаць прыхільнасць, наладжваць кантакт, а таксама, са слоў дырэктара, «трэба, каб вочы гарэлі і праца была не ў цяжар». Галерэя стала ўтульнай і на фізічным, і на эмацыйным, духоўным узроўні, што адчуваецца ўнутры калектыву і непасрэдна падчас размоў з наведвальнікамі і мастакамі. У «АртХаосе» працуюць тры кваліфікаваныя мастацтвазнаўцы, для кожнага з якіх паступова выкшталтаваліся асобныя задачы, зыходзячы з індывідуальных кампетэнцый і навыкаў. У асноўныя ж абавязкі супрацоўнікаў уваходзяць асветніцкая праца, паслугі арт-кансультанта, курыраванне праектаў і інш.

Падчас адкрыцця галерэі складаным пытаннем таксама было канцэптуальнае — колькі мастакоў будзе прадстаўлена і якім чынам, у прынцыпе, будзе праходзіць адбор прац для экспанавання ў «АртХаос»? Кіраўнік і яго каманда кансультантаў-мастацтвазнаўцаў, дзякуючы пэўнаму вопыту, без асаблівых рознагалосся і спрэчак, вырашылі не эксперыментаваць, а працаваць у «традыцыйным» кірунку.

**Канцэпцыя прадугледжвае прэзентацыю беларускага мастацтва, у асноўным класікі і сучаснага жывапісу, невялікай долі графікі і скульптуры.**

Галерэя самастойна звязвалася з мастакамі розных напрамкаў і прапаноўвала супрацоўніцтва. Спачатку не ўсе адгукаліся на запрашэнне, аднак даволі хутка колькасць мастакоў, якія хочуць выстаўляць свае працы ў галерэі «АртХаос», пачала павялічвацца.

Што тычыцца адбору работ, то перавага аддаецца высокамастацкім працам з выразнай кампазіцыяй, цікавым раскрыццём вобраза, творчым падыходам. Галерэя разглядае перш за ўсё работы, а не завастрае ўвагу на наяўнасці ў аўтара ганаровых званняў і дыпломаў з мастацкіх конкурсаў. Вядома, гэта ўсё адлюстроўвае поспех творцы і яго асобасны рост, аднак, аналізуючы досвед працы з кліентамі, можна адзначыць, што сітуацыі бываюць розныя. Некаторыя пакупнікі не звяртаюцца па змястоўную інфармацыю аб аўтарах. Чалавек выбірае сабе твор інтуітыўна, каб карціна была да душы, давала станоўчыя эмоцыі і будзіла думкі для разважанняў. Кагосьці прыцягвае канкрэтны стыль ці жанр, хтосьці ўглядаецца ў тэхніку выканання і захапляецца майстэрствам аўтара, яго талентам. Але таксама ёсць сегмент пакупнікоў, якія збіраюць уласную калекцыю, і звычайна для іх важны статус таго ці іншага мастака.

**Адзін з галоўных кірункаў дзейнасці галерэі — прэзентацыя беларускага мастацтва для шырокай аўдыторыі.**

Як правіла, адначасова ў экспазіцыі можна пабачыць каля 30 аўтараў, а гэта вялікае мноства твораў выяўленчага мастацтва. Фонд экспазіцыйных прац налічвае каля трохсот работ, агульная колькасць экспанентаў — больш за сто дзесяць беларускіх мастакоў і некалькі прадстаўнікоў блізкага замежжа. «АртХаос» прэзентуе творчасць майстроў розных напрамкаў, стыляў, школ і жанраў: гэта рэалісты, імпрэсіяністы, абстракцыяністы і інш. Таксама галерэя мае ўласны збор карцін нашых сучаснікаў і нават класікаў. Калекцыя створана для захавання ўнікальных твораў жывапісу, яркіх прыкладаў беларускага мастацтва. Важную частку экспазіцыйнага фонду складаюць работы маладых аўтараў, пераважна жывапісцаў, творчасць якіх адлюстроўвае прыхільнасць класічным мастацкім традыцыям, а таксама пошукі новых форм дзеля ўвасаблення арыгінальных задум.
Усе працы і класікаў, і сучаснікаў, прадстаўленыя ў галерэі «АртХаос», даступныя для набыцця. Галерэя мае анлайн-платформу: афіцыйны сайт з актуальнай інфармацыяй аб аўтарах, выставах, падзеях, адукацыйны кантэнт і непасрэдна апісанне экспанатаў з іх асноўнымі характарыстыкамі: з указаннем фармату, тэхнікі выканання. Сайт грае ролю дадатковага інструмента рэкламы.

**З моманту адкрыцця «АртХаос» займаецца не толькі галерэйнай справай і куратарствам персанальных выстаў. Паступова ўзрастае актыўнасць удзелу ў розных цікавых праектах, як самастойных, так і супольных.**

У рамках фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» двойчы (2019 і 2021) былі арганізаваны зборныя тэматычныя выставы жывапісу ў канцэртнай зале горада над Дзвіной. У 2021 годзе галерэя стала суарганізатарам маштабнага праекта — Спартыўна-культурнага фестывалю «Вытокі».
За пяць сезонаў у дваццаці адным беларускім горадзе адбыліся выставы жывапісу, твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, мастацкія інтэрактывы і майстар-класы.
З 2018 года галерэя «АртХаос» займаецца дабрачыннасцю. Менавіта тады адкрылася першая дабрачынная выстава-продаж «Любоў дзейнічае!». Сёння гэта спецыяльны праект галерэі, накіраваны на падтрымку людзей у тэрмінальнай стадыі анкалагічных захворванняў. Атрыманыя з пяці выстаў грошы ўжо дазволілі набыць для пацыентаў медыцынскіх устаноў і ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання абсталяванне, мэблю, інвентар, сродкі перамяшчэння, спецыялізаванае харчаванне і сродкі гігіены. Сёлета дабрачынная выстава запланавана на снежань, і многія мастакі ўжо актыўна адгукаюцца на ўдзел у ёй, каб шчыра ўнесці свой уклад у добрыя справы на карысць хворым людзям, якія маюць патрэбу ў дапамозе. Са слоў нашых пастаянных наведвальнікаў і саміх мастакоў, яны добра запомнілі яркае адкрыццё галерэі, якое адбылося 30 верасня 2017 года, і па сёння з вялікім задавальненнем праводзяць час у яе прасторы.
Не замыкаючыся ў сваіх залах, «АртХаос» служыць пасярэднікам паміж творцамі і аматарамі мастацтва, дае магчымасць жыхарам сталіцы, гасцям з розных абласцей і замежжа пазнаваць творчасць нашых мастакоў. Шырокая і актыўная дзейнасць галерэі арыентаваная на падтрыманне пазітыўнага іміджу краіны і развіцця беларускага арт-рынку. Ⓜ







Анлайн-платформа «АртХаос»:
інфармацыя аб аўтарах, выставах,
падзеях і адукацыйны кантэнт.
Сканруйце
для пераходу
на arthaos.com
АРТХАОС



Ксенія Ціханава.
«АРТХАОС» — МЕСЦА, ДЗЕ ЖЫВЕ МАСТАЦТВА РОЗНЫХ СТЫЛЯЎ І НАПРАМКАЎ»
*(стар. 44)*

ISSN 0208 — 2551
9 770208 255007 08025